# Грошы ў беларускім фальклоры: вясельная абраднасць



**Ірына КОЛАБАВА**

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, дацэнт, кандыдат гістарычных навук, Рэспубліка Беларусь, г. Мінск, e-mail: irynakolabava@mail.ru

Адносіны чалавека да грошай фарміруюцца ў прамой залежнасці ад дамінуючых у яго асяроддзі грамадскіх каштоўнасцей. Зразумела, што грошы ў першую чаргу з'яўляюцца эканамічнай з'явай, але асаблівасці гістарычнага развіцця ўнеслі свае карэктывы, пераўтварыўшы грошы ў сацыяльна-культурны феномен.

Грошы становяцца своеасаблівай цэнаснай меркай, якая сведчыць аб сацыяльным статусе, матэрыяльных магчымасцях, маральных устаноўках, псіхалагічных аспектах, кар'ерных поспехах чалавека. Праз прызму адносін да грошай можна меркаваць аб унутранай сутнасці і самаацэнцы асобы. Грошы адыгрываюць ролю адмысловай прылады, пры дапамозе якой будуецца цэласная структура грамадскіх адносін.

Неабходна адзначыць і вельмі моцны ўплыў грошай на духоўную сферу жыцця чалавека. У філасофскім рэчышчы грошы – гэта традыцыйнае для народнага фальклору спалучэнне паняццяў дабра і зла.

Разуменне грошай як сацыяльнага інстытута дазваляе разглядаць іх як складовую частку грамадскай сістэмы, у якой грошы адыгрываюць сувязную ролю.

Камунікатыўная роля грошай праяўлялася падчас народных святаў і ажыццяўлення рытуалаў сямейна-побытавай абраднасці (радзінаў, хрэсьбінаў, вяселляў, пахаванняў і інш.) [1; 2].

У працах вядомых беларускіх этнографаў XIX ст. – пачатку XX ст. І. Насовіча (1788–1877), П. Шэйна (1826–1900), М. Нікіфароўскага (1845–1910), Е. Раманава (1855–1922) падрабязна разглядаюцца ўсе акалічнасці правядзення вясельнага свята*.

Вяселле, як і любое іншае свята, вырывала чалавека са штодзённасці і ўносіла ў яго жыццё радасныя пачуцці. Асаблівую ролю ў прасторы вясельнага свята адыгрывалі грошы, якія былі не толькі сімвалам заможнага жыцця, але і сродкам магічнага ўздзеяння для закладвання будучага сямейнага дабрабыту. Трэба адзначыць таксама, што вясельныя абрады не маглі адбывацца падчас пастоў і некаторых рэлігійных святаў.

Традыцыйнае беларускае вяселле з лакальнай і матэрыяльнай варыятыўнасцю з'ўлялася даволі складаным па структуры святочным мерапрыемствам, у якім кожны ўдзельнік павінен быў дакладна выконваць адведзеную яму ролю. Але незалежна ад гэтага яно складалася з трох абавязковых этапаў: сватаўства, самога вяселля і паслявясельнай часткі.

Паказальна, што сцэнарый кожнага з гэтых кампанентаў вясельнага свята не абыходзіўся без актыўнага ўдзелу грошай. Увогуле цяжка ўявіць такое маштабнае святочнае мерапрыемства без грашовай асновы. Акрамя таго, што грошы забяспечвалі ўсе матэрыяльныя патрэбы вяселля, яны паралельна адыгрывалі і вельмі значную сімвалічную ролю, што даказваецца выкарыстаннем у абсалютнай большасці выпадкаў невялікіх грашовых сум. Такім чынам, значэнне набывае не памер грашовай сумы, а само магічнае па характары дзеянне з грашыма.

Многія назвы грашовых адзінак прайшлі адаптаванне ў адпаведнасці з мясцовымі гаворкамі, маюць шэраг варыянтаў і патрабуюць расшыфроўкі. Грошы маглі быць прадстаўлены папяровымі банкнотамі (зрэдку) і манетамі (большасць выпадкаў). Зафіксаваны абагуленыя назвы – грошы («деньги»), назвы, якія ўказвалі на нязначнасць наміналу – дробныя («мелинькия») манеты, вызначэнне металу – медныя, срэбныя («белинькия»), залатыя манеты.

Характэрна, што творы народнага фальклору зафіксавалі як актуальныя для свайго часу (капей-

* У цытатах захоўваецца аўтарскае напісанне.

ка, рубель), так і старадаўнія (талер, шостак, грош, шэлег, палушка) грашовыя тэрміны. Шырокае выкарыстанне набыла і неафіцыйная («народная») грашовая тэрміналогія (пятак, дзясятка (5 капеек/10 грошаў), чацвяртак (25 капеек/50 грошаў), залатоўка (15 капеек/30 грошаў, ці злоты), саракоўка (20 капеек/40 грошаў), чырвоны, «залатая» грыўня, «залатая» капейка.

Адлюстраваць сімволіку грошай у вясельнай абраднасці можна на прыкладзе існавання адпаведных прымет і магічных рытуалаў, а таксама абрадавых песень.

У грошах канцэнтруецца ідэя сямейнага дабрабыту і шчаслівай будучыні. Далей прыводзяцца толькі некаторыя матэрыялы з вялікага аб'ёму сабраных па тэме даследавання, якія паказваюць, што грошы – абавязковы, а часам і асноўны рытуальны прадмет усіх вясельных абрадаў.

Шматлікія выпадкі выкарыстання грошай у вясельным свяце прыведзены ў працы П. Шэйна, прысвечанай апісанню побыту і мовы беларускага насельніцтва. Аўтар падкрэслівае значнасць і абавязковасць усіх этапаў гэтага святочнага мерапрыемства і піша, што «нигде крестьянская свадьба не сопровождается такими церемониями и обрядами, как в Белоруссии... Изменить, или пропустить что-либо из свадебного обряда, считается преступлением. Если же что-либо подобное произошло во время свадьбы, то это почитается нехорошим предзнаменованием для молодой четы. Одним словом, обрядовая сторона свадьбы возведена как бы в догмат и равносильна, по их понятию, церковному браку» [6, с. 426].

Звяртаючыся да асобных частак вяселля ў Слуцкім павеце, П. Шэйн піша, што на этапе правядзення запоінаў (адбываліся пасля змовінаў) бацька жаніха ў дамоўлены час браў вядро гарэлкі, грошы, падарункі ад жаніха і ехаў адзін без сватоў да нявесты. Нявеста частавала яго гарэлкай, а будучы свёкар падаваў ёй грошы на талерцы [6, с. 444]. Пры адорванні грашыма маладога яго бацька браў гарэлку і клаў на талерку «3, 5, 10 р. и больше, делая рукой с тарелкой круги в воздухе – слева направо…» [6, с. 448].

У Мазырскім павеце на этапе сватаўства сват наліваў гарэлку ў чарку, кідаў у яе залатоўку (15 капеек) і падаваў сястры нявесты і нявесце. Чарку з гарэлкай і залатоўкай падносіў нявесце і жаніх. Дружкаў бацька жаніха частаваў гарэлкай і адорваў манетай вартасцю 3 капейкі, што адпавядала 6 грошам і называлася шостакам [6, с. 395–397].

На пачатку святкавання пад кіраўніцтвам вясельнага старасты адбывалася ўзаемаадарэнне галоўных удзельнікаў свята. Ім прапанавалася чарка з гарэлкай, у якой была манета адпаведнай вартасці, што падкрэслівала статус асобы. Сват атрымліваў дзясятку (5 капеек), сястра нявесты – залатоўку (15 капеек), сваха дзве дзясяткі і златоўку (у суме – 25 капеек), а нявеста – саракоўку (20 капеек) [6, с. 410–411]. Стараста, атрымаўшы каравай, клаў на талерку чацвяртак ці шостак (2–3 кап.) [6, с. 418].

У Мазырскім павеце П. Шэйн зафіксаваў і такі звычай, калі ў царкве «пред аналоем, вместо ковра, постилают под ноги кусок холста, на который кладут медные деньги» [6, с. 428].

У М. Нікіфароўскага адзначалася, што вяселле нельга спраўляць на пазычаныя, нават у нязначным памеры, грошы, інакш маладых будзе чакаць недаўгавечная і гаротная будучыня [3, с. 67]. Для забеспячэння заможнага жыцця жаніх закладаў у правую халяву ботаў некалькі срэбных манет, а нявеста падчас вянчання павінна была пакласці пад грудзі з левага боку срэбную манету, каб у будучых дзяцей былі «чыстыя галоўкі» [3, с. 58].

Аб'ёмнае даследаванне побыту беларускага насельніцтва, у тым ліку і традыцый правядзення вясельнага свята, было зроблена Е. Раманавым.

У Віцебскім павеце, калі нарэшце жаніх і нявеста з гасцямі садзіліся за стол, брат нявесты расплятаў ёй касу, за што яму ў чарку з гарэлкай апускалі манету. Выпіўшы гарэлку, брат павінен быў дастаць манету, хутка ўскочыць на стол і з рота пырснуць на свата гарэлкай. Сват жа, калі паспяваў, караў нявесцінага брата загадзя падрыхтаваным бізуном [5, с. 359–360].

У Веліжскім павеце пасля вянца маладыя раз'язджаліся па сваіх хатах. У нявесты збіраліся на частаванне госці, якія адорвалі яе грашыма – «кто кладет две, кто три, а кто пять копеек». Калі ўвечары прыязджаў жаніх, то адорваў нявесту 30 капейкамі і сыходзіў, а свацця выводзіла нявесту на парог хаты, дзе атрымлівала ад жаніха выкуп за яе – 30 капеек і пляшку гарэлкі [5, с. 429].

У Дрысенскім павеце пасля таго, як жаніх і сваты атрымалі згоду бацькоў, нявеста дарыла жаніху хустку, а той даваў ёй пэўную суму грошай [5, с. 382]. Калі маладыя вярталіся пасля вянца, то ў вёсках па дарозе іх прапускалі далей толькі за выкуп [5, с. 387]. Падчас вяселля нявесту адорвалі грашыма сваякі і суседзі [5, с. 383].

У Гарадоцкім павеце існавала некалькі варыянтаў правядзення вяселля. Калі дзяўчына і яе бацькі былі згодныя на шлюб, бацька жаніха наліваў у чарку гарэлку, кідаў туды манету вартасцю 20 капеек і падаваў нявесце, тая вылівала гарэлку праз плячо, а грошы забірала сабе. Бацькі маладых заключалі дамову аб выдатках на вяселле. Звычайна жаніх быў абавязаны даць нявесце на вяселле 10 ці 15 рублёў. Калі ж сваты збіраліся ад'язджаць, нявеста выводзіла іх коней за браму і атрымлівала ад сватоў рубель [5, с. 393].

Падчас адорвання нявесты яе хросны бацька браў вялікую гліняную чарку і наліваў усім, хто падыходзіў да стала з грашыма, гарэлку. Нявеста пры

атрыманні грошай (ад гроша да 5 капеек) галасіла і дзякавала за дары [5, с. 397]. Абавязкам нявесты была аплата працы дудара, якога прыводзіў жаніх.

У **Невельскім павеце** пры сватаўстве нявеста дарыла жаніху хустку, за якую той даваў грошы – ад 50 капеек да 2 рублёў, у залежнасці ад матэрыяльных магчымасцей [5, с. 439]. Пры благаславенні нявесты на стол, накрыты абрусам, ставілі хлеб-соль, а зверху бацька дзяўчыны клаў рубель грошай [5, с. 441]. Пасля гэтага нявеста падыходзіла да бацькі жаніха, прымала з яго рук чарку гарэлкі з пакладзенай туды манетай, але адмаўлялася выпіць яе. Свёкар угаворваў яе такімі словамі: *«Кали ни выпивать, дык на руки выливать и сирябро сабе брать!».* Нявеста вылівала гарэлку на рукі, забірала грошы і кланялася свёкру [5, с. 444].

У сваю чаргу сват і дружка частавалі хросных нявесты гарэлкай і дарылі ім 10 ці 5 капеек. Сват падводзіў дружку да баярак, якія казалі: *«Мы покажым дорошку мима батюшкинага вакошку….там деўки па палушки, на Кажымякинскам бирягу па шылягу!... Наш тавар вочан дораг: што ступень, то рубель, каса сто рубелёў, самой – цаны нет….Мы ат вас нічаво ня видали: ни аўсянага пиражышка, ни меднага шыляжышка!».* Сват пачынаў дражніць баярак і паказваў ім медныя пятакі, а баяркі ў адказ дэманстравалі папяровы рубель і срэбра ды гаварылі: *«Дайти нам таких (показывают на рубль), а хош и мелиньких, ды белиньких».* Сват у выніку даваў ім рубель [5, с. 445].

У сцэнарыі вяселля прысутнічаў і абрад выкупу кубла (куфара) з пасагам, прычым значэнне мела колькасць абручоў на ім.

Падчас гандлю ў працэсе сватаўства ў Гомельскім павеце бацька прасіў за дачку 10 рублёў, але ў выніку сыходзіліся на 8 рублях. Сям'я жаніха плаціла святару за вянчанне 3 рублі, а таксама набывала для вяселля на 45 рублёў гарэлкі, віна, піва і мёду. Нявесціна дружка за некалькі капеек прышывала жаніху на шапку кветку з чырвонай стужкі і за гэта атрымлівала ад дружкі жаніха некалькі капеек [5, с. 452–453]. Калі жаніх з дружынай прыязджаў да нявесты, то моладзь зачыняла яе ў хаце і патрабавала «заплотитя бочку вина и сто рублей грашами... Дружина соглашается и дает им бутылку водки, пирог хлеба и денег несколько копеек» [5, с. 456].

Атрымаўшы каравай, бацька гаварыў: «Дарую я сваим маладым… чарвонага залатога, тёлку, аўцу и свиньню…» [5, с. 458].

У Быхаўскім павеце нявеста падносіла жаніху на талерцы хустку, а ён клаў на талерку срэбныя грошы, пірог і ставіў чарку гарэлкі. Грошы нявеста брала сабе, а гарэлку і пірог па кавалках раздавала старшаму дружку і сяброўкам [5, с. 480].

Пры ад'ездзе нявесты да жаніха цешча садзілася на прыпечак і пляла лапці. Дружка жаніха падносіў ёй на талерцы чарку гарэлкі, некалькі манет і прасіў спыніць пляценне і ўзяць грошы на боты [5, с. 491].

Вельмі значна, што Е. Раманаў звяртаў увагу на матэрыяльны і сямейны стан будучых мужа і жонкі. Вяселле працягвалася каля тыдня ў заможных і 2–3 дні ў небагатых сем'ях. У заможных дамах на вяселле (не ўключаючы пасаг) выдаткоўвалася да 100 рублёў, у небагатых сем'ях – да 75 рублёў, а ў бедных – да 40–50 рублёў [5, с. 452, 471]. П. Шэйн піша, што выдаткі на святкаванне з боку сям'і жаніха складалі ад 50 да 70 рублёў, а сват нявесты рабіў унёсак да 15 рублёў [6, с. 426].

Пры стварэнні новай сям'і ўдаўцамі вяселле было скарочаным і выдаткоўвалася на яго не больш за 5 рублёў. Вяселле сіраце ладзілася па звычайным сцэнарыі, а выдаткі складалі да 40–50 рублёў [5, с. 461].

Грашовая тэрміналогія сустракаецца і ў абрадавых песнях, якія былі абавязковым элементам усіх этапаў вясельнага свята. Гэтыя рытуальныя магічныя творы павінны былі забяспечыць маладым заможнае і шчаслівае жыццё.

Узгадваюцца вясельныя абрадавыя песні ў этнаграфічных матэрыялах, сабраных на тэрыторыі Беларусі І. Насовічам і П. Шэйнам:

*Твой шестак битый, а мое три гроши; / Повенчаемся, мой милый хорошій! / Твой талерик битый, моя золотовка; / Повенчаемся, мила белогловка* [4, с. 104].

У каравайнай песні быў зварот да гасцей: *«Вы, пріяцели, глядзице / И по целковому кладзице»* [4, с. 193].

Пры ад'ездзе маладых у царкву спявалі: *«Што мы раненько встали, попа ошукали (надули), / Да не дорго отдали, за паненку копейку / А за того молодого – пов-золотого»* [4, с. 209].

Пры адорванні маладой спявалі: *«Дзядзички лебедзички, кладзице капеечки… / Дзецюки молойчики, кладзице червончики…»* [4, с. 213–214].

У Мазырскім павеце былі запісаны спевы дружак падчас дзялення каравая ў маладой: *«Ой, ты, дружатко, войтову сын! / Ускинь на тарелочку золотых семь (1 р. 5 к.) / Ой ты дружатко войтову зяць, / Ускінь на тарелочку золотых пяць!»* [6, с. 416]. Прыведзены тэкст дае магчымасць вызначыць суадносіны капеек і грошаў (1 капейка = 2 грошы).

Больш значны па аб'ёме вясельны песенны масіў уключаны ў «Белорусский сборник» Е. Раманава. Аўтар, указваючы павятовую лакалізацыю сабранага матэрыялу, прыводзіў тэксты спеваў, якія суправаджалі асобныя часткі вясельнага мерапрыемства.

У Віцебскім павеце пры вяртанні ад вянца спявалі: *«…А мы попа ашукали, / Дёшыва за шлюб дали: / Зы свайго мыладога / Пуўтыра зылатога, / Зы сваю мыладую / Капейку зылатую»* [5, с. 363].

Характарызуючы нявесту, адзначалі, што *«Толька адна Сахвейка дарагая: / Касица ие стоить сто рублей, / Уплёты ие стоють тысячу, / Самой*

*жа маладой цаны нет!»*. А затым запрашалі: *«Надиляйтя Сахвеичку / Ни рублём-палтиною, / Залатою гриўнаю!»* [5, с. 375–376].

У Лепельскім павеце падчас вясельнага гуляння сваццця абыходзіла гасцей і прасіла адарыць нявесту грашыма, пры гэтым дружкі спявалі: *«Дитюки, малойчики, / Кладитя чирвоньчики! / Мущинки маладыя, / Кладитя залатыя! / Девачки, паненачки, / Кладитя капеички!...»* [5, с. 380].

Пры адорванні нявесты ў Дрысенскім павеце родныя і суседзі спявалі: *«…Тётачки, дядички, хуть ну пятаццы, / Ближнія суседи хуть ну рубялечку, / А малыя рибятки хуть ну капеиццы!»* [5, с. 388].

У Гарадоцкім павеце вясельны абрад выкупу касы маладой таксама не абыходзіўся без песень. Брат нявесты браў лучыну, тачыў яе аб печку і крычаў, што калі яму не дадуць выкуп, ён адрэжа ў сястры касу. Тады сват прапаноўваў тры капейкі, а брат патрабаваў рубель, але, нарэшце, гандаль завяршаўся на суме ў 20 капеек. Падчас гэтага абраду жанчыны спявалі: *«... А брат систре татарин, / Прадаў систру за талир, / Русу косу за питак, / Беля тела вот за сяк!»* [5, с. 412].

Для госця, які пры зборы грошай маладым нічога не даваў, у Гомельскім павеце дружкамі нявесты была падрыхтавана спецыяльная парада: *«Ты садьвинься з местичка, / Ты садьвинься са скупога. / Пыд табой сто рублей, / Пыд табой тысича»* [5, с. 415].

У абрадзе выкупу нявесты, калі ў дружкаў жаніха патрабавалі бóльшую суму выкупных грошай, спявалі: *«Ета ня грошы – / Ета медь; / Садись на свинньню – / Дамоў едь, …За етыя грошы / Купі сабе мыла. / Памый сабе рыла…»*. Пры выкупе нявесцінай касы гучала: *«Татарын, братка, татарин! / Аддае сястру задарам, / Русаю касу за питак, / Белая лицо аддаў так»* (Гомельскі павет) [5, с. 468].

Падводзячы вынікі, трэба адзначыць шырокую прысутнасць грошай у абрадах, магічных рытуалах, прыметах і абрадавых песнях вясельных святаў. Цікава, што ў выкарыстанні былі як сучасныя на той час, так і старадаўнія грашовыя назвы, часам у форме неафіцыйнай тэрміналогіі, адаптаванай у рэчышчы мясцовых гаворак. Грошы адыгрывалі і значную сімвалічную ролю, аб'ядноўвалі ў адзіную сістэму ўсе элементы традыцыйнага беларускага вяселля.

Такім чынам, вынікі вывучэння вясельнай абраднасці яшчэ раз даказваюць значнасць сацыяльна-культурнага аспекту такой з'явы, як грошы.

## Бібліяграфічны спіс


1. Колабава, І.Н. Канцэпт «грошы» ў беларускіх прыказках і прымаўках / І.Н. Колабава // Банкаўскі веснік. – 2021. – № 11 (700). – С. 7–11.
2. Колабава, І.Н. Феномен «грошы» ў беларускай этнаграфічнай і літаратурнай спадчыне XIX – пачатку XX ст. / І.Н. Колабава // Матэрыялы навук. канф. «Памяць продкаў праз музейны свет (мінулае, сучаснасць і будучыня музеяў пад адкрытым небам)», Бел. дзярж. музей нар. арх. і побыту, Мінск, 7 снежня 2021 г. – Мінск, 2021. – С. 242–253.
3. Никифоровский, Н.Я. Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи, легендарные сказания о лицах и местах / Н.Я. Никифоровский. – Витебск, 1897. – 307 с. и 26 с. примечаний.
4. Носович, И.И. Белорусские песни. Записки Императорского Русского географического общества. По отделению географии [Электронный ресурс] / И.И. Носович – СПб., 1873. – Т. V. – С. 45–280; СПб.: Тип. Майкова, 1874. – 236 с. – Режим доступа: https://zapadrus.su/bibli/etnobib/138-q-q-1873.html. – Дата доступа: 25.07.2023.
5. Романов, Е.Р. Белорусский сборник [в 9 вып.] / Е.Р. Романов. – Вильно: Типография А.Г. Сыркина, 1885–1912. – Вып. 8: Быт белорусов. – 1912. – 600 с.
6. Шейн, П.В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края / П.В. Шейн. – Т. III. – СПб.: Тип. Имп. Акад. Наук, 1902. – 535 с.


## Money in Belarusian Folklore: Wedding Rituals

**Iryna KOLABAVA,** Belarusian State University of Culture and Arts, Associate Professor, Candidate of Historical Sciences, Republic of Belarus, Minsk, e-mail: irynakolabava@mail.ru

**Abstract.** Money plays the role of a special instrument with the help of which an integral structure of social relations is built. The author of the article notes its unique role in the wedding celebration, since its was not only a symbol of a prosperous life, but also a means of magical influence paving the way for future family well-being.